ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З КРАСАВІКА 1955 ГОДА ● ● № 3 (3639) ● ● ЧАЦВЕР, 25 САКАВІКА, 2021

ВЫДАННЕ "ГОЛАС РАДЗІМЫ" ЧЫТАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY



**Прыгажосць з нацыянальным адценнем**
Стар. 3



**"Крымка" помніць пра Журыхі**
Стар.4



**Багата песень там — як журавін!**
Стар.8

ПАДЗЕЯ

# Жыццядайная сіла памяці

## Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на рэспубліканскім мітынгу-рэквіеме "Лампада памяці", прымеркаваным да 78-й гадавіны Хатынскай трагедыі

Паважаныя суайчыннікі! Госці Беларусі!

Трагедыя Хатыні і тысяч вёсак і гарадоў з такім жа лёсам — гэта боль, які не сціхае ў сэрцы беларусаў, усіх савецкіх людзей. Сёння мы, прадстаўнікі розных пакаленняў, рэлігійных канфесій, філасофскіх і палітычных поглядаў, сабраліся разам, каб ушанаваць памяць бязвінных і абараніць праўду аб той вайне. Гэта праўда жорсткая, гэта памяць цяжкая. Удумайцеся: акупанты і іх саўдзельнікі-паліцаі спалілі 9200 беларускіх вёсак. З іх больш як 5000 — разам з жыхарамі. І мы ведаем, з чаго гэта ўсё пачынаецца: з ідэй расавай і генетычнай, любой іншай перавагі адных народаў над іншымі, з падзелу на вышэйшых і другарадных. Страшна тое, што гэтыя тэорыі і сёння знаходзяць сваіх прыхільнікаў па ўсім свеце. Але, дзякуй Богу, фашысцкая ідэалогія чужая для нашых беларусаў, чыя генетычная памяць стала сапраўдным нацыянальным імунітэтам.

У гэтай памяці шмат болю і пакут, у ёй трагічны гістарычны вопыт. Гэта факт. Другая сусветная была не проста вайной, яна стала планамерным знішчэннем нашых славянскіх народаў.



БЕЛТА

Удзельніцы мітынга-рэквіема з лампадамі памяці

У гэты памятны вечар напярэдадні чарговай гадавіны Хатынскай трагедыі я хацеў бы звярнуцца да тых, хто свядома спрабуе адрадзіць сімвалы нацызму. Няхай гэта адзінкі (як кажуць, у сям'і не без вырадка), але такія, на жаль, ёсць у сучаснай Беларусі.

Я звяртаюся да ўсіх, хто ўпэўнены, што фашызм "нёс на нашу зямлю цывілізацыю"; хто гераізуе забойцаў; хто пакланяецца БЧБ-сцягам, пад якімі чыніўся генацыд беларускага народа. Мы заняліся гэтай праблемай, і мы дакажам і пакажам усяму свету, што такое генацыд і што тыя, хто сёння нас спрабуюць павучаць, як жыць, як мінімум не маюць на гэта права. Усім вам, аблудным і адурманеным, гавару: "Ідзі і глядзі!" Ідзі ў Хатынь, Боркі, Алу, Дальву, Усакіна, Шунёўку, Азарычы, да мемарыялаў "Трасцянец", "Яма", "Чырвоны Бераг".

Глядзі: вачамі дзіцяці, якое выжыла пад целам забітай маці; вачамі дзяцей, кінутых паміраць у калодзеж; вачамі застрэленай цяжарнай жанчыны, якая так і не спазнала шчасце мацярынства; вачамі бацькі, які дастаў з попелу мёртвага сына; вачамі павешаных бездапаможных старых.



БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка ў Хатыні

Ідзі і слухай Хатынскі звон, у якім разам зліліся дзіцячыя крыкі, мацярынскі плач і горкі бацькаўскі смутак мільёнаў беларусаў. Беларусаў, якія зведалі нечалавечыя пакуты, але не пакораных і не пераможаных. Мы гэта павінны з вамі помніць заўсёды і не баяцца ў вялікія святы, якая б бяда ні нахлынула на нас (пандэмія кавід або іншыя хваробы), прыходзіць у светлы Дзень Перамогі і аддаваць належнае ім, якія загінулі дзеля нас. Таму што, калі б яны не загінулі, нас не было б.

І няхай гэтыя галасы з мінулага кожнаму пакаленню нагадваюць аб тым, які няўстойлівы свет, якое каштоўнае чалавечае жыццё і як лёгка ўсё гэта страціць. І пакуль гучыць гэты звон, Беларусь памятае.

Нам ніколі не забыць страшэнныя старонкі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Мы ніколі не даруем жорсткасць, бесчалавечнасць і бясчынствы ворага на нашай зямлі. Мы гэта памятаем, і ў гэтым наша сіла.

Вечная памяць забітым, закатаваным і змучаным. І схілім жа галовы і ўшануем іх памяць мінутай маўчання.

БЕЛАРУСКІ МАЦЯРЫК

# Навуковы подзвіг Яўхіма Карскага

**Дзе знаходзяцца спрадвечна беларускія землі? Знакаміты мовазнаўца, родам з Гродзеншчыны, гранічна дакладна сфармуляваў адказ на гэтае пытанне — з фактамі ў руках**

Акадэмік Яўхім Карскі быў першым, хто грунтоўна даследаваў беларускую лексікаграфію, словаўтварэнне, граматыку, дыялекталогію, этналінгвістыку. Сёлета ёсць добрая нагода згадаць пра таленавітага педагога й навукоўцу: 1 студзеня 2021-га былі яго 160-я ўгодкі. А пабачыў Яўхім свет у праваслаўнай сям'і настаўніка Фёдара Карскага, які паходзіў са збяднелай шляхты, і дачкі праваслаўнага дыякана Магдалены Навіцкай — у 1861 годзе. Паколькі нарадзіўся хлопчык яшчэ перад шлюбам бацькоў, то спачатку прозвішча меў па маці. З бацькамі правёў дзіцячыя гады на зямлі Навагрудскай — у вёсках Ятра ды Бярозавец, жыла сям'я й на Меншчыне. Па нацыянальнасці ж бацькі яго былі беларусамі, што відаць з пазнейшай зацемкі Яўхіма Карскага пра тое, што ён "прыродны беларус". Гадаваўся будучы акадэмік у вялікай сям'і: 8 дзяцей! Жыхары вёскі Лаша (Гродзенскі раён) ганарацца земляком. Там больш за 50 гадоў працуе ў школе Мемарыяльны музей Яўхіма Карскага. І абласная бібліятэка носіць яго імя. Яўхім Фёдаравіч — адзін з найвядомых выпускнікоў Менскай духоўнай семінарыі ды Нежынскага гістарычна-філалагічнага інстытута імя князя А. А. Безбародкі (цяпер: Нежынскі дзяржуніверсітэт, Украіна).

Пачынаў ён сваю педагагічную кар'еру ў 2-й Віленскай гімназіі. Ягоныя лекцыі памяталі й выпускнікі Імператарскага Варшаўскага ўніверсітэта (на пасадзе рэктара там жа раскрыўся талент Карскага як арганізатара вышэйшай адукацыі), Растоўскага ўніверсітэта, Мінскага пядінстытута, наведнікі Менскіх беларускіх настаўніцкіх курсаў (з іх пачынаўся Мінскі беларускі педінстытут). Ён жа быў на чале аргкамісіі па стварэнні Беларускага дзяржуніверсітэта. (Дарэчы, і бібліятэку сваю ўніверсітэту падараваў. Мала хто цяпер згадвае, аднак менавіта Яўхім Карскі быў ганаровым старшынёй Першага ўсебеларускага з'езда (снежань 1917-га) і ледзьве пазбег арышту пры ягоным разгоне, з'ехаўшы ў Петраград. — **Рэд.**)

Калі педагогу было 25 гадоў, выйшла ягоная манаграфія "Обзор звуков и форм белорусской речи". (Масква, 1886) — даследаванне яшчэ з гадоў студэнцтва. Тым і пачалося навуковае беларускае мовазнаўства. У хуткім часе, гады праз два, Яўхім Карскі сцвердзіўся і ў галіне параўнальнага мовазнаўства: як укладальнік выдання "Грамматика древнего церковно-славянского языка, сравнительно с русским: учебник по русскому языку для IV класса средних учебных заведений". Нібыта й падручнік, а ўспрымаць яго спецыялісты адразу ж пачалі як аўтарытэтную мовазнаўчую працу, яе шматкроць перавыдавалі ў Расійскай імперыі: да рэвалюцыі 1917-га было 19 перавыданняў! Рыхтавалася й 20-е, аднак не ўбачыла свет, бо новая ўлада пачала будаваць атэістычную дзяржаву.




Мікалай Несцярэўскі. Медальён "Яўхім Карскі". 2005 г.

Яўхім Карскі яшчэ у студэнцкія гады пачаў глыбока вывучаць мясцовыя беларускія гаворкі: на грунце як помнікаў пісьменства, так і вынікаў уласных этнаграфічных экспедыцый па Гарадзенскай, Віленскай, Менскай губернях. Каштоўны скарб — ягоныя запісы фальклору.
→ Стар. 6

ISSN 0439-3619
9 770439 361003 21003

РОДНЫЯ ЛЮДЗІ

# Дома бываць — часцей!

## Установы культуры розных рэгіёнаў Бацькаўшчыны цяпер будуць больш актыўна супрацоўнічаць з беларускімі суполкамі за мяжой

МАРЫЯ ПАМЕЦЬКА




**Беларусы з Даўгаўпілса на “Вішнёвым фэсце” ў Глыбокім. 2016 г.**

З такой ініцыятывай выступіла Міністэрства культуры Беларусі ды Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. Напрыканцы лютага ў мінскім Храме-помніку ў гонар Усіх Святых яны правялі круглы стол “Новыя формы работы рэгіёнаў Беларусі з грамадскімі аб’яднаннямі беларусаў замежжа”. Паўдзельнічаць у ім запрошаны былі дырэктары й спецыялісты абласных цэнтраў народнай творчасці, кіраўнікі творчых калектываў краіны, прадстаўнікі ўпраўленняў культуры, галоўных упраўленняў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкамаў ды Мінскага гарвыканкама.

У часе імпрэзы шмат гаварылася пра тое, што было зроблена ў гэтым кірунку за апошнія гады. Сапраўды нямала! “Многія ўстановы культуры ў розных рэгіёнах даўно маюць сувязі з калегамі за мяжой,— гаворыць дырэктар РЦНК Вольга Антоненка.— На розныя святы, фэсты, напрыклад, яны заўсёды запрашаюць творчыя калектывы з іншых краін. Праўда, часцей гэта былі гурты, ансамблі, якія дэманстравалі ў Беларусі культуру той краіны, з якой прыехалі. Інтарэсы ж музычных, вакальных або танцавальных гуртоў беларускіх суполак, якія прэзентуюць нашу культуру там і жадаюць, каб іх заўважылі на Бацькаўшчыне, улічваліся не заўсёды. На круглым стале мы раздалі ўсім прысутным спісы кіраўнікоў беларускіх суполак замежжа — з адрасамі, тэлефонамі, кантактнымі дадзенымі. І цяпер удзельнікі размовы змогуць без праблем наладзіць з супляменнікамі сувязі. РЦНК ужо ў верасні гэтага года мае намер запрасіць актывістаў беларускіх суполак з іншых краін на Фэст мастацтваў беларусаў свету ў Мінск”.

У РЦНК вядзецца вялікая праца па наладжванні такіх сувязяў: для кіраўнікоў творчых калектываў беларускіх суполак замежжа некалькі разоў на год ладзяцца стажыроўкі, да таго ж ім перадаецца мастацкая і метадычная літаратура, шыюцца на заказ беларускія нацыянальныя касцюмы.

Усяляк спрыяюць і гатовы надалей дапамагаць рэгіёнам у наладжванні кантактаў з беларусамі замежжа і супрацоўнікі апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій ды нацыянальнасцяў, Міністэрства замежных спраў, Нацыянальнага агенцтва па турызме. Павел Сапоцька, які нядаўна ўзначаліў апошняе, прапанаваў новую форму працы з беларускімі суполкамі замежжа. Ён лічыць, што варта выходзіць на беларускія суполкі ў замежных гарадах-пабрацімах, з якімі ў рэгіёнаў Беларусі добрыя стасункі складваліся гадамі. А сябруюць яны з 440 рэгіёнамі прыкладна ў 40 краінах! Нацыянальнае агенцтва па турызме збіраецца выпусціць даведнік-праваднік па найбольш знакавых помніках гістарычна-культурнай і прыроднай спадчыны Беларусі, які паспрыяе і развіццю турызму, і міжнароднай супрацы.

Алена Радчанка, намесніца Упаўнаважанага па справах рэлігій ды нацыянальнасцяў, сярод іншага ўнесла такую прапанову: актывізаваць супрацу з установамі агульнай і сярэдняй адукацыі іншых краін, дзе выкладаецца беларуская мова. Начальнік упраўлення глабальнай палітыкі й гуманітарнага супрацоўніцтва МЗС Аляксандр Апімах заклікаў удзельнікаў круглага стала шукаць больш нагодаў, каб запрашаць беларусаў, якія жывуць за мяжой, у Беларусь. На яго думку, нашы супляменнікі з замежжа тады лепш змогуць адчуць сваю далучанасць да падзей, што адбываюцца тут.

Прапаноўваліся таксама іншыя формы, метады супрацы, якая, нагадаем, даўно вядзецца на дзяржаўным узроўні. Пры МЗС, напрыклад, дзейнічае Кансультатыўны савет па справах беларусаў замежжа. Працы з дыяспарай спрыяе Закон “Аб беларусах замежжа”. Многія культурныя імпрэзы ладзяцца ў плыні падпраграмы “Беларусы ў свеце” Дзяржпраграмы “Культура Беларусі”.

**Ганна Лагун**

ТРАДЫЦЫІ

# У гонар Кабзара

**Супрацоўнікі Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур з гасцямі, прадстаўнікамі грамадскасці Мінска правялі вечарыну да 160-й гадавіны з дня смерці Тараса Шаўчэнкі**

Імпрэза ў гонар знакамітага ўкраінскага паэта й мастака прайшла 10 сакавіка. Прачулыя словы любові, павагі да Кабзара ўкраінскага народа выказалі дарадца-пасланнік Амбасады Украіны ў Беларусі Вольга Цімуш, старшыня Беларускага грамадскага аб’яднання ўкраінцаў “Ватра” Уладзімір Кадзіра, сябар Грамадскага культурна-асветніцкага аб’яднання ўкраінцаў “Краяны” з Маладзечна Міхаіл Лысакабылка, старшыня Мінскага грамадскага аб’яднання ўкраінцаў “Заповіт”, заслужаная работніца культуры Украіны Галіна Калюжная, загадчык аддзела Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Вольга Пархімовіч, а таксама журналіст і навуковец Глеб Кудрашоў: дзякуючы інтэрнэтсувязі ён зрабіў медыяпрэзентацыю з Палтавы.




**Кніга выкладчыка і журналіста з Палтавы Глеба Кудрашова, які прадставіў у час імпрэзы сваю медыяпрэзентацыю, прысвечаную Кабзару**

На сцэне гучалі вершы “генія, якому судилася вечність” на ўкраінскай, беларускай, казахскай, польскай, грузінскай ды літоўскай мовах: як сведчанне таго, што геній шануюць і далёка за межамі Украіны. Вядома, напрыклад, што, “Заповіт” перакладзены больш чым на 150 моў свету. Гучалі на імпрэзе таксама ўкраінскія, беларускія песні ў выкананні салістаў і мастацкіх калектываў Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур.

Калі знакамітую песню “Реве та стогне Дніпр широкий” спяваў у зале РЦНК лаўрэат міжнародных і ўсеўкраінскіх конкурсаў Аляксандр Валодчанка, то падхапілі яе ўсе — як даніну памяці Кабзару, як знак павагі да ягонага таленту.

**Алесь Лозка,** *загадчык аддзела народнай творчасці Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур*

РАЗАМ

# Адгукаецца болем Хатынь

**Мітынг-рэквіем “Звонят колокола Хатыни” прайшоў 22 сакавіка ў крымскай Еўпаторыі, на мемарыяле “Красная горка” — па ініцыятыве тамтэйшых беларусаў, з падтрымкаю гарадскіх улад**

Сцэнар мерапрыемства распрацавала Дзіна Шаўчэнка, кіраўніца дзвюх суполак: Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі “Крым — Беларусь” і Крымскай рэспубліканскай культурна-асветніцкай арганізацыі “Беларускі Крыма” імя Еўфрасінні Полацкай. У мітынгу-рэквіеме паўдзельнічалі мясцовыя дэпутаты, прадстаўнікі гарадміністрацыі, сябры беларускіх суполак, прадстаўнікі нацыянальна-культурных аўтаномій горада (грэкі, армяне, азербайджанцы, караімы, украінцы, немцы, балгары, татары), курсанты дзіцячага клуба “Патрыот”.

На мітынгу-рэквіеме Дзіна Шаўчэнка расказала, як адладжваліся й цяпер умацоўваюцца сувязі беларусаў Крыма, згаданых суполак з адміністрацыяй Дзяржаўнага мемарыяльнага комплекса “Хатынь”. Дарэчы, мы пісалі, што дзякуючы дзейнасці суполкі “Крым — Беларусь” там бывалі крымскія ветэраны, якія ўдзельнічалі ў 1944-м у вызваленні нашай Бацькаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

ДЗІНА ШАЎЧЭНКА



**Ускладанне кветак у часе мітынгу-рэквіема ў Еўпаторыі**

Над еўпатарыйскім мемарыялам “Красная горка” гучала песня “Сказ о Хатыни” Аляксандра Вайтэнкі — члена Саюза кампазітараў Расіі, лаўрэата прэміі імя Дувана. Кампазітар быў сярод удзельнікаў мітынгу. Музыку ён пісаў на верш Генадзя Цемічава, песня пачынаецца так: “Мы слышим и поныне/ Печальный звон Хатыни —/ Он душу своей скорбью леденит./ Мы с болью здесь узнали,/ Как люди умирали —/ Всем тяжко от безмолвных серых плит”. Ноты, словы, кампакт-дыск з песняй да Дня памяці былі дасланыя і ў Хатынскі мемарыял.

Яшчэ адзін твор, прысвечаны трагедыі ў лясной беларускай вёсцы, прынесла на мітынг і дэманстравала выкладчыца Еўпатарыйскай мастацкай школы, актывістка суполкі “Крым — Беларусь” Алена Прынь. Гэта яе графічная праца “Хатынь”. Пра сам Хатынскі мемарыял расказала Людміла Айзенштэйн з Сімферопаля — сяброўка суполкі “Беларускі Крыма” імя Еўфрасінні Полацкай. У праўленне суполкі ўваходзіць і жыхарка пасёлка Лясноўка Сакскага раёна Крыма Галіна Баранава. Яна піша вершы, сяброўка літаб’яднання “Сакские Родники”. Спадарыня Галіна чытала ўрывак з паэмы “Молитва матери”. Свой твор яна прысвяціла бацькам ды іншым жыхарам вёскі Муціжар Калінкавіцкага раёна Гомельшчыны. Вёска была спалена карнікамі ў гады вайны, потым наноў адбудавана.

“Гваздзікі ў Букет памяці (78 кветак — бо 78 гадоў прайшло з часу Хатынскай трагедыі), дзіцячыя цацкі перадалі-прывезлі сяброўкі суполкі “Беларускі Крыма” імя Еўфрасінні Полацкай з Ялты, Сімферопаля, Сак, Краснаперакопска, Сімферопальскага ды Сакскага раёнаў,— напісала ў рэдакцыю Дзіна Шаўчэнка.— Да помніка “Скорбящая мать” на мемарыяле “Красная горка” еўпатарыйцы ўсклалі кветкі, дзіцячыя цацкі. Напрыканцы мітынгу святар Пётр Дворнікаў адслужыў там жа ліцію — малітву-памінанне пра загінулых у Хатыні. Букет памяці ўдзельнікі мітынгу перадалі праз святара ў часовую царкву пры храме Андрэя Першазванага ў Еўпаторыі — для далейшага памінання ў часе набажэнстваў душаў загінулых”.

**Іван Ждановіч**

КОНКУРСЫ

# Прыгажосць з нацыянальным адценнем

## На Другім адкрытым конкурсе творчасці і прыгажосці “Грацыя International”, што прайшоў у Віцебску, свае нацыянальныя культуры прадставілі фіналісткі з 9 краін

Дзівоснае было шоу! Канкурсанткі не толькі шпацыравалі па сцэне ў нацыянальным адзенні, але й частавалі гасцей нацыянальнымі стравамі. Прычым 18 сакавіка за фіналам конкурсу можна было сачыць у анлайн-фармаце па YouTube-канале. Каларытам свайго ўбрання і гарманічнасцю вобразу пакарыла журы дзяўчына з Індыі: Суямбу Кесеван Хема. Студэнтка-старшакурсніца з Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медуніверсітэта атрымала карону і тытул “Міс Грацыя International”.



Студэнтка з Індыі Суямбу Кесеван Хема — “Міс Грацыя International”-2021

Арганічна выглядала ў атмасферы творчага спаборніцтва Нтаголе Мугарука Люсі з Конга. Адметны ўбор студэнткі Віцебскага дзяржуніверсітэта імя П. М. Машэрава быў вельмі да твару, ён падкрэсліваў як прыгажосць дзяўчыны, так і яе характар. Мугарука Люсі не стамлялася прыязна ўсміхацца ў часе фотасесіі, потым на прэс-канферэнцыі, на сцэне, ды так абаяльна, што ўсім, падаецца мне, хацелася з ёй пасябраваць. І журы слушна прысудзіла дзяўчыне тытул “Міс Дружба”.

Нельга было не заўважыць — у чырвоным уборы! — і туркменку Джэмал Юсупаву, студэнтку архітэктурнага факультэта БНТУ. Напярэдадні конкурсу мы страчаліся з Джэмал, і яна казала: нацыянальныя строі ў Туркменістане дзяўчаты, жанчыны й сёння носяць амаль штодзень, у школу ці на працу. Гэта звычайна сукенка, часцей чырвонага ці зялёнага колеру, з арнаментам. Хусткай галаву пакрываюць замужнія туркменкі, а дзяўчатам дазваляецца хадзіць з непакрытай галавой ці ў цюбецейцы: тах’і. Сваю сукенку Джэмал узяла, калі ехала ў Беларусь вучыцца: маці падказала, што можа спатрэбіцца, і не памылілася. А галаўны ўбор дзяўчыне давялося шукаць у Беларусі. Знайшла! Упрыгажэнні ў нацыянальным стылі былі й на шыі, руках. Эфектна, прыцягальна. Нездарма дзяўчыне прысудзілі званне “Міс фота”. Прыгажуня-Джэмал яшчэ й разумніца: ведае некалькі моваў, акрамя туркменскай. На ўзбекскай навучыла яе размаўляць бабуля, бо ў яе сям’і былі ўзбекі. Турэцкую асвоіла з цёткай, якая працуе архітэктарам у турэцкай фірме. Рускую ўдасканаліла ў Беларусі, калі пачала займацца на архітэктурным факультэце.


Вікторыя Вараб’ёва з караваем


Джэмал Юсупава частуе гасцей чаем

Паколькі ў яе групе вучыцца шмат беларусаў, то зацікавілася й беларускай мовай, ужо разумее яе й можа сёе-тое сказаць. Апошнім часам дзяўчына захапілася іспанскаю мовай.

На сваіх нацыянальных мовах канкурсанткі з Кітая, Узбекістана, Туркменістана, Азербайджана, Індыі, Шры-Ланкі, Беларусі, Конга, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі чыталі вершы, расказвалі гісторыі, легенды, прыпавесці. Да конкурса дзяўчаты прыгатавалі нацыянальныя стравы. Тым, хто быў у журы, вельмі спадабаліся прысмакі ад Аіды Адалет Сулейманавай з Азербайджана, студэнткі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Яна і стала пераможцай у “кулінарнай” намінацыі. Канкурсанткі, дарэчы, дэманстравалі свае аратарскія здольнасці, былі творчы конкурс, дэфіле, быў і анлайн-конкурс групаў падтрымкі. Да таго ж прыгажуні добра пелі і танцавалі: была ў дзяўчат магчымасць і знешнюю прыгажосць паказаць, і ўнутраны свет прыадкрыць.

Першай віцэ-міс стала беларуска Вікторыя Вараб’ёва, студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, другой віцэ-міс — дзяўчына з Кітая Го Мэн’яо, якая вучыцца ў Віцебскім дзяржуніверсітэце імя П. М. Машэрава.

**Ганна Лагун**

РАЗАМ

# Самадзейнасць — гэта дзейнасць

**Выйшаў другі том кнігі “Творчыя калектывы беларусаў замежжа”. У выданні сабрана шмат цікавай і карыснай інфармацыі пра таленавітых супляменнікаў з розных краін.**

Нагадаем, першы том кнігі пабачыў свет напрыканцы 2019 года. І мы пра тое пісалі: “Самадзейныя: родныя, надзейныя”. — ГР, 02.10.2019. У ім пададзены матэрыялы пра развіццё, станаўленне творчых суполак беларусаў за мяжой. У Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур упэўнены: з выхадам 2-га тома выдання нацыянальна-культурная прысутнасць беларусаў у свеце, на розных кантынентах стала яшчэ больш відавочнай.



Пра розныя суполкі, творчых гурты піша наша газета. І ўсё ж — далёка не пра ўсе! Бо ў свеце дзейнічае каля 200 творчых беларускіх калектываў. Звесткі пра іх сабралі супрацоўнікі РЦНК: кіраўнік аддзела народнай творчасці, кандыдат філалагічных навук Алесь Лозка і намесніца дырэктара РЦНК Валянціна Грышкевіч. Па словах аўтараў, найбольш пашыраныя за мяжой ансамблі беларускай песні, асабліва ў Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, Эстоніі. А танцавальных калектываў значна менш. Апошнім часам зменшылася й колькасць калектываў тэатральных. Ёсць хоры, харавыя капэлы, фальклорныя, харэаграфічныя, вакальныя, вакальна-харэаграфічныя, інструментальныя, вакальна-інструментальныя, фолк-рокавыя ансамблі. Ёсць і творчыя аб’яднанні мастакоў, пісьменнікаў, а таксама сямейныя, жаночыя, мужчынскія, дзіцячыя ды іншыя творчыя суполкі.

Узроставы дыяпазон удзельнікаў калектываў — ад дзяцей да пенсіянераў. Прычым у беларускіх творчых гуртах знаходзяць сабе месца для самарэалізацыі не толькі беларусы ды нашчадкі былых перасяленцаў з зямлі нашай Бацькаўшчыны: “літвіны”, “літвякі”, “палешукі”, “палачаны”, “палякі з мовай беларускай”, “віленцы”, “магілёўцы”, “самаходы” ды іншыя нашы суродзічы ў расійскай Сібіры, Казахстане. Ёсць выхадцы з беларускіх сем’яў і з паселішчаў Зямлі Беларускай. Нават ёсць такія беларусы ў замежжы, якія нікуды й не перасяляліся — прыкладам, ва усходняй Польшчы. Значная частка калектываў — змешанага тыпу: напрыклад, беларусы, украінцы й рускія. Адпаведна й рэпертуар — змешаны, як, напрыклад, у Сербіі: там ёсць вакальны ансамбль “Раса”.

Цікава, што ў некаторых краінах творчыя калектывы пазданыя, працуюць супольна ў культурных цэнтрах. І наша газета нямала піша, напрыклад, пра справы, праекты Цэнтра беларускай культуры ў латвійскім Даўгаўпілсе, а гэта ж — установа тамтэйшай гарадской думы. Плённа працуе і дзяржаўная бюджэтная ўстанова Новасібірскі цэнтр беларускай культуры — у Сібіры, у Расіі. У розных краінах аматары самадзейнай творчасці збіраюцца на фэсты беларускай песні: як, напрыклад, у Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі.

Кожныя тры гады творчыя калектывы спевакоў, музыкаў, танцораў, а таксама й мастакі, пісьменнікі, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва запрашаюцца ў сталіцу Беларусі на вялікі Фэст мастацтваў беларусаў свету. Мяркуецца, што пройдзе ён і сёлата. Да таго ж кіраўнікі аматарскіх калектываў мастацкай творчасці прыязджаюць штогод у РЦНК на тыднёвую творчую стажыроўку: яна ладзіцца з удзелам прафесійных калектываў мастацкай творчасці Беларусі. Каб быць у курсе спраў — падтрымлівайце кантакты з РЦНК, з беларускімі дыппрадстаўніцтвамі ў замежжы.

Першы і другі тамы кнігі “Творчыя калектывы беларусаў замежжа” былі выдадзены ў межах падпраграмы “Беларусы ў свеце” Дзяржпраграмы “Культура Беларусі” на 2016–2020 гады.

**Ганна Лагун**

УЗНАГАРОДА

# Віншуем, Адам Восіпавіч!

**Навуковец, прафесар, наш старэйшы калега Адам Мальдзіс ушанаваны супляменнікамі з Канады за працу, што паспрыяла развіццю беларускай культуры й літаратуры**

“З нагоды ўзнагароды” — так назваў вершаванае прысвячэнне сябру, дасланае і ў рэдакцыю, пісьменнік Сяргей Панізьнік. Як эпіграф у ім: “Дыпломам Беларускага Інстытута Навукі й Мастацтва Канады за 2020 год адзначаны Адам Мальдзіс — за надзвычайны ўнёсак у развіццё беларускай культуры й літаратуры”. Паэт вытлумачвае падзею так: “Дыплом ганаровы, бо стаў лаўрэат:/ зрабіў незвычайны Адаме уклад/ у развіццё, і віццё, і быццё/ таго, што завецца Айчыны Жыццё”.

Доўгі час Адам Восіпавіч пісаў пра вядомых людзей, працэсы ў беларускай дыяспары, папрацаваў і ў рэдакцыі “Голасу Радзімы”. З аднадумцамі стварыў энцыклапедычны даведнік “Сузор’е беларускага замежжа”. Кіраваў Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў і застаецца яе ганаровым старшынёй. За шматгранную культурную дзейнасць у 2013-м Адам Мальдзіс ушанаваны ордэнам Францыска Скарыны.

**Іван Іванаў**

ТАЛЕНТЫ

# “Крымка” помніць пра Журыхі

## Родавыя карані ў крымскай беларускі Людмілы Цімашчук — з Вілейскага раёна

У ліку актывістак нядаўна створанай Крымскай рэспубліканскай культурна-асветніцкай арганізацыі “Беларускі Крыма” імя Еўфрасінні Полацкай — і Людміла Цімашчук, у дзявоцтве Квяткевіч. У адрозненне ад іншых сябровак суполкі, родам яна не з Беларусі: пабачыла свет 60 гадоў таму (10 студзеня 1961 года) у Крыме. Малая радзіма — сяло Бліжнегародскае ў Джанкойскім раёне. Гадавалася ў беларускай сям’і, там і светапогляд нашай сяброўкі закладваўся. Пасля школы закончыла Сімферопальскі інжынерна-будаўнічы інстытут, працавала інжынерам-будаўніком: у Армянску, Краснаперакопску. Восем гадоў была ў адной з перасоўных механізаваных калон інжынерам па ахове працы.

З гадамі Людміла сферу дзейнасці памяняла — і дасягнула поспехаў на шляху творчай самарэалізацыі. З 1995-га кіравала ў Краснаперакопску студыяй дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Кудесница”: у Цэнтры дзіцячай і юнацкай творчасці. Студыя стала ўзорным калектывам. Беларуска мае званне “Выдатнік адукацыі Украіны”, ушанавана граматамі Мінкультуры Крыма (2001, 2006, 2007), Мінкультуры Украіны (2004, 2005). Сёння Людміла Цімашчук — майстар дэкаратыўна-прыкладной творчасці, кіруе адпаведнай студыяй “ЯнтаРА” ў краснаперакопскім Гарадскім палацы культуры. Выгадавала з мужам Валянцінам сыноў Івана ды Аляксандра, ёсць і унукі: Аляксандр і Ганна.

Спадарыня Людміла сабрала і ўзначаліла беларускую суполку ў Краснаперакопску ды амаль 20 гадоў актыўна пашырае беларускую культуру ў Крыме. На красавік запланавана персанальная выстава ў Сімферопалі: у Крымскім этнаграфічным музеі. А да Дня памяці святой Еўфрасінні Полацкай (5 чэрвеня) сяброўкі майстрыхі задумалі зладзіць яе выставу ў Еўпаторыі: у зале “Дружбы народов” бібліятэкі імя Лесі Украінкі. Дарэчы, летась Людміла зрабіла габелен “Еўфрасіння Полацкая” і нядаўна падарыла яго суполцы “Беларускі Крыма” імя Еўфрасінні Полацкай — як абярэг. Праца гэтая была прадстаўлена ёй на ІІІ Міжнародны фестываль мастацтва “Российский Берег. Осенняя феерия online” (праводзіўся ў дыстанцыйным фармаце), і атрымала майстрыха дыпломам 3-й ступені ў намінацыі “мастацка-прыкладная творчасць”.

Бацькі Людмілы — абодва з Беларусі: маці, Вера Мікітаўна (у дзявоцтве Герасіменка) родам з вёскі Акрыёны (па-руску: Акрионы) Петрыкаўскага раёна Гомельшчыны, а тата, Іван Васілевіч Квяткевіч — з вёскі Журыхі Вілейскага раёна Міншчыны. Чорны след пакінула ў жыцці дзяўчынкі Веры вайна: бацьку прызвалі ў войска ў першыя дні вайны. Дома засталіся трое малых дачок — Вера, Надзея, Любоў — і цяжарная жонка Тацяна. Больш ні іх, ні сына свайго Аляксандра ён не ўбачыў. Мікіта Герасіменка трапіў у палон пад Ленінградам і неўзабаве памёр у фашысцкім канцлагеры. Пра тое родныя даведаліся толькі некалькі гадоў таму.

Бацькі Людмілы пазнаёміліся пасля вайны на лесапавале пад Волагдай. Пазней сястра бацькі, Марыя, расказвала: ён знайшоў самую прыгожую дзяўчыну з доўгай густой касой і вялізнымі блакітнымі вачыма, вясёлую і адчайную беларуску. Пажаніліся Іван з Верай ды паехалі ў Казахстан, падымаць цаліну. Пазней па вярбоўцы сям’я Квяткевічаў трапіла ў Паўночны Крым — там і пусціла карані. Стэп з выпаленай сонцам травой, без прахалоднага беларускага лесу й празрыстых рэчак іх спачатку ашаламіў. Вера не хацела заставацца ў Крыме, але прайшоў час, нарадзіліся дочкі — Людміла й Валянціна. Пабудавалі там дом свой, выгадавалі сад, вінаграднік. “Родителям удалось на небольшом участке земли создать то пространство любви, в котором мне хорошо и покойно,” — напісала Людміла пазней. Прыжыліся ў Крыме беларусы, а тужыць па Беларусі не перасталі, настальгія заўсёды была побач. Па словах Людмілы, бацькі былі людзі простыя, умелі добра працаваць, былі “ад прыроды інтэлігентнымі”, любілі жыццё, людзей. Яны адзін за адным пайшлі з жыцця, калі ёй было толькі 33 гады. І дачка заўсёды згадвае іх з вялікай удзячнасцю за падараванае жыццё, за тое, што далі ёй адукацыю, навучылі любіць і Крым, і Беларусь.

Незабыўныя ўражанні ад спаткання з Журыхамі, роднаю вёскай бацькі, Людміла Цімашчук (Квяткевіч) апісала, і той кранальны тэкст ёсць у інтэрнэце — знойдзецца па ключавых словах ці па сказе: “Но есть и более мощные корни. Они там, в Белой Руси, они у меня в генной памяти, и это показала поездка в Белоруссию”. А трапіла на зямлю бацькоў “крымка”, як назвала яе адна вясковая бабуля, з фальклорным гуртом “Лепота”, у якім Людміла ўжо 25 гадоў. Сустракала вёска Журыхі крывінку сваю з крымскага берага ў 2000-м, калі гурт з Краснаперакопска ехаў аўтобусам у Паставы, на фэст “Звіняць цымбалы й гармонік”. Заканчэнне ж у спавядальным тэксце такое: “А самое главное — то, что я унесла в своём сердце от этой встречи: любовь к своей красивой Белоруссии, понимание и участие своих друзей, и память предков, что заложена во мне отпечатком огромной Любви, которую трудно передать словом, а можно понять лишь сердцем”.

**Дзіна Шаўчэнка**, кіраўніца суполкі “Беларускі Крыма” імя Еўфрасінні Полацкай, г. Еўпаторыя



Людміла Цімашчук. Габелен “Еўфрасіння Полацкая”.

ДЗІНА ШАЎЧЭНКА



Людміла Цімашчук са сваімі працамі на выставе “Созвездие белорусских талантов Крыма” ў плыні Дзён беларускай культуры ў Крыме. Крымскі этнаграфічны музей, 30 чэрвеня 2016 года. Сімферопаль.

А ЯК У ВАС?

# Шматфарматная Масленіца

**Даўняя беларуская традыцыя развітання з Зімой у розных краінах набывае свае адметнасці**

**Пад небам Іарданіі**

Аксана Чамеза з Амана даслала ў рэдакцыю тэкст, здымкі. “У суботу, 6 сакавіка сябры суполкі беларусаў у Іарданіі, стомленыя зімой ды пандэміяй, сабраліся вузкім колам і вырашылі весела й з карысцю правесці час: каб паспрыяць набліжэнню Вясны й добраму настрою адпаведна”,— піша актывістка суполкі. На Масленіцу, што праходзіла ў летняй рэзідэнцыі сям’і Аль-Алімат, запрасілі й прадстаўнікоў Амбасады Беларусі. Дарэчы, гаспадар сядзібы Алі, ягоная жонка-беларуска Надзея, дзеці Аміра, Цімур, Мурад актыўна прымаюць удзел у падобных дзеях.

Вядоўцамі на свяце былі скамарохі, у якіх усе пазнавалі Аксану Чамезу ды Надзею Аль-Алімат. Яны народ весялілі, у карагоды ўсіх запрашалі, а Тацяна Мішчанка (дарэчы, родам з Віцебска) расказала пра Масленічныя традыцыі беларусаў. Далей для фармату “прыемнае з карысным” прыйшоўся да месца святочны стол: з беларускімі блінамі. Розныя былі: салодкія, салёныя, з прыпёкам, з творожком! А з гліняных гаршкоў выглядвалі беларускія стравы: дранікі, бабка, хрусты, піражкі з бульбай, калдуны й нават лянівыя калдуны. Гатавалі стравы сама Аксана ды Надзея Аль-Алімат, Ала Філіповіч, Тацяна Мішчанка. І некаторыя з гасцей прыйшлі на свята — з блінамі.

Пасля пачастункаў рушылі ўсе Зіму праганяць. Ладзілі танцы рытуальныя, варожбы: якой Вясна будзе сёлета. І дзецям гульні знайшліся. Так што Масленіца ў іарданскім фармаце, заключае Аксана Чамеза, прайшла як мае быць.



У Іарданіі — Масленіца

**Фотаконкурс у Даўгаўпілсе**

З 1 па 14 сакавіка Даўгаўпілскі Цэнтр беларускай культуры праводзіў фотаконкурс “Бліны на Масленку”: у гонар Масленкі (Масленіцы). Падведзены яго вынікі, пераможцы атрымаюць дыпломы й кулінарную кнігу “Кірмашоўскія прысмакі”. Пра тое нам напісала метадыстка ЦБК Марыя Памецька.



Як вядома, свята гэтае ў нашых продкаў цесна было спалучана з культам Сонца, якое бярэцца ў сілу — адсюль і традыцыйныя бліны. “Круглыя, гарачыя, залацістыя — бліны сапраўды можна ўспрымаць як мініяцюрныя выявы свяціла”,— піша Марыя. І аб’яўлены ЦБК фотаконкурс даў магчымасць ва ўмовах кавідных абмежаванняў праявіць творчую актыўнасць: прыгатаваць дома бліны, заправіць іх радасным настроем і пазітывам, падзяліцца фотаздымкамі з іншымі. Больш за 60 кухараў-фотааматараў адгукнулася на прапанову! Вызначаны найбольш цікавыя й крэатыўныя працы. Падрабязнасці, фотаздымкі — на сайце даўгаўпілскай суполкі “Уздым” у інтэрнэце: https://uzdim.lv/be/

**Іван Ждановіч**

ДОБРЫЯ СПРАВЫ

# Родная мова ў Самары

**Моладзевае аддзяленне, творчы гурт, партнёры Самарскай абласной гарадской арганізацыі беларусаў і выхадцаў з Беларусі “Руска-Беларускае Братэрства 2000” паўдзельнічалі ў імпрэзах, прысвечаных Дню роднай мовы**

Да свята быў падрыхтаваны майстар-клас “Знаёмства з беларускай азбукай”, адзняты на відэа. У яго відэапрэзентацыі паўдзельнічаў Артур Карповіч, кіраўнік Уфімскага аддзялення Пасольства Беларусі ў Расіі. Перад тым у горадзе адзначалі Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў (15 лютага). Педагог з 176-й школы Алена Балвашэнкава, да таго ж актывістка беларускай дыяспары, падключыла вучняў да ўдзелу ў гарадскім дыстанцыйным конкурсе “Мы о той войне стихами…”. Быў праведзены пошук паэтаў, ураджэнцаў і жыхароў Беларусі, якія прайшлі дарогамі Афганскай вайны. Іх творы гучалі ў часе імпрэзы: вершы “Я позабыл Афганскую войну” Віктара Верстакова (родам з Полаччыны, з пасёлка Ветрына), “Ожидание” Леаніда Малчанава — ён пасля вяртання з Афганістана служыў і жыў у Беларусі.

Яшчэ прайшоў фестываль нацыянальных культур “На языке дружбы народов” — у Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы Самары пры ўдзеле нацыянальных нядзельных школ, з падтрымкай гарадміністрацыі. Беларускую культуру й літаратуру там прадставілі навучэнцы нядзельнай школы “Родны кут” (дзейнічае пры суполцы “Руска-Беларускае Братэрства 2000”, чытальнікі й вакалісты з 176-й школы, Цэнтра пазашкольнай адукацыі “Творчество”.

МІКАЛАЙ БОЙКА



Кіраўніца суполкі Ірына Глуская з Віталінай Пановай, удзельніцай фестывалю

**Мікалай Бойка**

# Кроплі збяруцца — мора ўтвараецца

## Беларусь і Узбекістан актыўна развіваюць супрацоўніцтва ў сферы адукацыі

Нядаўна ў Мінску адзначалі 580-годдзе з дня нараджэння Алішэра Наваі. Маючы дачыненні ў юбілейныя дні з дарадцам Амбасады Узбекістана ў Беларусі Даніярам Абідавым, нямала гаварылі мы й пра тое, што цяпер актыўна развіваюцца кантакты між нашымі краінамі, народамі. У тым ліку й культурныя, адукацыйныя. Дарэчы, у кнізе Алішэра Наваі "Улюбёны сэрцаў", выдадзенай да юбілею ў Мінску (гл.: "Паклон табе, Сонца з Усходу!" — ГР, 26.02.2021) вялікі суфій запісаў свае развагі й пра карысць навучання, ведаў. Вось адно з іх: "Той, хто распытвае пра тое, чаго не ведае, выяўляе сваю вучонасць, а той, хто саромеецца распытваць — паказвае сваё глупства. Патроху пераймаючы веды, чалавек навучаным становіцца: калі шмат кропель збярэцца, то й мора ўтворыцца. Той, хто пазбягае вучобы,— гультай, а хто для таго адгаворкі знаходзіць,— нягоднік, і тым, хто імкнецца ведамі наталіцца, ты перад імі перавагу аддавай".

Данiяр Таджыевіч з гонарам адзначаў: амаль у дзесяць разоў за час працы Амбасады (з мая 2018 года) ўзрасла колькасць узбекскіх студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў Беларусі. А гэта, заўважым, справа ўзаемавыгадная: ва Узбекістане шмат ахвочых вучыцца, у Беларусі — добрыя для таго ўмовы. Каля 2000 студэнтаў прынялі адукацыйныя ўстановы Беларусі навучацца па сумесных з узбекскімі ВНУ навучальных праграмах па схемах 2+2 і 1+1 у 2020–2021 навучальным годзе (а ў папярэднім, для параўнання, 1500). Схемы ж названыя вызначаюць, што малады чалавек 2 гады вучыцца ва Узбекістане і потым 2 гады працягвае навучанне ў Беларусі па праграмах бакалаўрыяту, па 1 годзе — па праграмах магістратуры. Калі казаць мовай эканамістаў, то экспарт беларускіх адукацыйных паслуг ва Узбекістан за мінулы год склаў $ 1,7 млн, павялічыўшыся ў параўнанні з папярэднім амаль на 14%.

Яшчэ свежая інфармацыя з гэтае сферы. На пачатку сакавіка 2021 года, паведамілі нам у Амбасадзе, прайшоў візіт беларускай урадавай дэлегацыі ў Ташкент. І ў часе яго кіраўнікі ВНУ нашых краін падпісалі яшчэ 10 дакументаў аб супрацы. У перамовах, якія праходзілі ў Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Узбекістана, удзельнічалі Міністр адукацыі Беларусі Ігар Карпенка ды Міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Узбекістана Абдукадзір Ташкулаў, кіраўнікі шэрагу вядомых беларускіх вну: БДУІР, БНТУ, БДТУ, Віцебскага дзяржуніверсітэта імя П. М. Машэрава, Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы, Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Францыска Скарыны, Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі ды Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы. Прайшлі перамовы прадстаўнікоў беларускай дэлегацыі з міністрамі дашкольнай адукацыі і народнай адукацыі, госці наведвалі вышэйшыя й сярэднія ўстановы адукацыі. Бакі ўзгаднілі, падпісалі План сумесных дзеянняў паміж Міністэрствам адукацыі Беларусі ды Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Узбекістана на 2021–2025 гады.

Цяпер паспяхова працуюць сумесныя факультэты, рэалізуюцца таксама беларуска-ўзбекскія адукацыйныя праграмы (у тым ліку з выдачай двух дыпломаў), адкрыты Беларуска-Узбекскі міжгаліновы інстытут прыкладных тэхнічных кваліфікацый у Ташкенце. А ў планах — стварэнне Узбекска-Беларускага ўніверсітэта матэрыялазнаўства.

Вось і ў часе візіту Ігар Карпенка разам з Алішэрам Умаравым, рэктарам Ташкенцкага дзяржпедуніверсітэта імя Нізамі, гаварылі пра далейшае развіццё супрацоўніцтва, развіццё ўзбекска-беларускага сумеснага факультэта "Інавацыйная педагогіка", створанага на базе гэтага ўніверсітэта. Заўважым: сёння на факультэце навучаюцца 288 студэнтаў, і асноўны ўхіл там зроблены на падрыхтоўку сучасных, крэатыўна думаючых настаўнікаў.

Каментуючы тыя падзеі, Даніяр Абідаў адзначыў: кіраўнік Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў ад самага пачатку прэзідэнцтва (2016 г.) надае асаблівую ўвагу развіццю й падтрымцы моладзі краіны, дзе амаль 55% насельніцтва (больш за 18 мільёнаў чалавек) ва ўзросце да 30 гадоў. Прэзідэнт не раз падкрэсліваў, што ва ўсіх рэформах любая задача, якая тычыцца будучыні моладзі, мае першараднае значэнне.

Дзякуючы садзеянню Амбасады Узбекістана мы пагутарылі з Алішэрам Умаравым, рэктарам ТГПУ. Атрымалася цікавая размова і пра моладзевую палітыку Прэзідэнта Шаўката Мірзіёева, і пра развіццё ўзбекска-беларускай супрацы ў галіне вышэйшай адукацыі. "Сёння Узбекістан скіраваны ў будучыню, а яна, як вядома, пачынаецца ўжо ў нашыя дні: з навучання, выхавання моладзі, з дзяржаўнае ўвагі да праблемаў маладых людзей,— сказаў Алішэр Юсубжанавіч.— Мы ганарымся, што менавіта Прэзідэнт Узбекістана з высокай трыбуны Генеральнай асамблеі ААН абвясціў ініцыятыву аб прыняцці Міжнароднай канвенцыі аб правах моладзі, якая падтрымана сусветнай супольнасцю. Былі й важныя прапановы па развіцці гэтай ініцыятывы. А ў самым Узбекістане 2021-ы названы Годам падтрымкі моладзі ды ўмацавання здароўя насельніцтва. Ужо рэалізуецца Канцэпцыя развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ва Узбекістане да 2025 года. Адна з яе мэтаў: ад нараджэння і да 30-годдзя ўсім узбекістанцам аказваць усебаковую падтрымку й дапамогу для таго, каб кожнаму знайшлося месца пад сонцам, годнае месца ў жыцці".

Алішэр Умараў падкрэслівае, што Шаўкат Мірзіёеў паставіў задачу такую: умацоўваць сувязі з вядучымі замежнымі ўніверсітэтамі, навуковымі, а таксама інавацыйнымі цэнтрамі, пашыраць з імі супрацу ў галіне падрыхтоўкі кадраў: "Цяпер, як вядома, Беларусь і Узбекістан — гэта стратэгічныя партнёры, а ў нашых прэзідэнтаў Шаўката Мірзіёева і Аляксандра Лукашэнкі склаліся цёплыя, сяброўскія дачыненні. Прэзідэнты падпісалі Пагадненне між урадамі Узбекістана й Беларусі аб узаемным прызнанні дакументаў аб навучанні ды адукацыі. Партнёрства з беларускімі вну, якія валодаюць важкім навуковым патэнцыялам, сталі аўтарытэтнымі цэнтрамі навукі ды адукацыі ў свеце, мы разглядаем у шэрагу прыярытэтаў пры пашырэнні трансгранічнай вышэйшай адукацыі. Ужо ёсць спрыяльныя ўмовы для маладых людзей, якія жадаюць "свет паглядзець", прадоўжыць навучанне ў дружалюбнай краіне".


Студэнтка Беларускага ўніверсітэта інфарматыкі ды радыёэлектронікі Севінч Алімхаджаева родам з Узбекістана

Рэктар ТГПУ рыхтаваўся да нядаўняга візіту калег з Беларусі, добра валодае інфармацыяй пра супрацу нашых краін у сферы адукацыі. Ён заўважыў, што вну Узбекістана раней падпісалі 55 дагавораў (а з улікам апошняга візіту — ужо 65!) і мемарандумаў аб супрацы з вядучымі беларускімі ВНУ. Распрацаваны й зацверджаны 87 "дарожных карт" для рэалізацыі такіх пагадненняў. Алішэр Умараў адзначае: "У 2018 годзе 215 студэнтаў з Узбекістана ўпершыню былі прынятыя ў тры беларускія ВНУ па сумесных адукацыйных праграмах (double degree). З 2020-га яшчэ 15 вну Узбекістана вядуць падрыхтоўку кадраў у плыні такіх праграм. Сёння ўжо 38 ВНУ Узбекістана маюць супрацоўніцтва з 17 ВНУ Беларусі, ужо больш за 4000 студэнтаў навучаюцца па САП з беларускімі вну па спецыяльнасцях, неабходных для Узбекістана. У рамках САП з беларускімі вну ва ўніверсітэтах-партнёрах рэалізуюцца 56 напрамкаў адукацыі бакалаўрыяту і 18 спецыяльнасцяў магістратуры з выдачай двайных дыпломаў".

Алішэр Умараў адзначае: Ташкенцкі дзяржаўны педуніверсітэт імя Нізамі цяпер самым непасрэдным чынам уключаны ў жывы струмень узбекска-беларускіх "адукацыйных" дачыненняў. Дарэчы, калі ў 2019-м у Мінску праходзілі Дні культуры Узбекістана, то ў складзе афіцыйнай дэлегацыі ад сяброўскай краіны была й выкладчыца з Ташкента, старшыня Беларускага культурнага цэнтра "Світанак" Святлана Дудзюк. Выступаючы на адной з сустрэч, яна казала: "Цяпер дзейнасць "Світанка" скіраваная на збераджэнне й пашырэнне беларускай мовы. Пры падтрымцы Беларускага дзяржпедуніверсітэта імя Максіма Танка мы адкрылі Беларуска-Узбекскі адукацыйны цэнтр на базе Ташкенцкага дзяржпедуніверсітэта імя Нізамі. Прычым на вывучэнне беларускае мовы запісалася больш маладых узбекаў, якім наша культура цікавая, чым ташкенцкіх беларусаў".

Рэктар ТГПУ Алішэр Умараў патлумачыў, што з 2018 года дзейнічаюць сумесныя факультэты між гэтымі ўніверсітэтамі, а таксама паміж Беларускім дзяржпедуніверсітэтам інфарматыкі ды радыёэлектронікі (БДУІР) і Ташкенцкім універсітэтам інфармацыйных тэхналогій імя Мухамада аль-Харэзмі. А ў 2020-м Ташкенцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам (БНТУ) і Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі (Беларусь) сумесна заснаваны Беларуска-Узбекскі міжгаліновы інстытут прыкладных тэхнічных кваліфікацый. На згаданым раней факультэце "Інавацыйная педагогіка" ёсць 4 напрамкі: лагапедыя, практычная псіхалогія, дашкольная адукацыя й пачатковая адукацыя. Там навучаецца 351 студэнт, выкладаюць 67 прафесараў-выкладчыкаў з БДПУ і 57 — з ТГПУ. Створаны 57 сумесных навучальных праграм і 27 вучэбна-метадычных комплексаў. "Выпускнікі атрымаюць дыпломы адразу дзвюх вядучых вну!" — акцэнтуе ўвагу Алішэр Юсубжанавіч.

Сёння тыя, хто ўжо ўключаны ў сумесныя праекты, адукацыйныя беларуска-ўзбекскія праграмы, плануюць пашыраць супрацоўніцтва. Алішэр Умараў агучыў такія ідэі: арганізаваць Савет рэктараў беларуска-ўзбекскіх ВНУ, стварыць Узбекска-Беларускі фонд па навукова-акадэмічных абменах і трансферы тэхналогій — каб рэалізоўваць сумесныя навуковыя праекты, даследаванні маладых навукоўцаў, спрыяць абмену студэнтамі, прафесарамі й выкладчыкамі абедзвюх краін.

**Іван Ждановіч**

**ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ**

## Разам ваявалі, разам памяць зберагаем

**Знойдзены ў Гродне ордэн Чырвонага Сцяга, які належаў загінуламу пры вызваленні Беларусі ў 1944 годзе ўраджэнцу Узбекістана, перададуць на радзіму героя**

На розных медыя-рэсурсах Беларусі з'явілася інфармацыя пра ўрачыстую цырымонію перадачы ордэна прадстаўнікам Амбасады Узбекістана ў Беларусі. Прайшла яна 18 сакавіка ў ваенкамаце Гродзенскай вобласці.

Як патлумачыў нам дарадца Амбасады Узбекістана ў Беларусі Даніяр Абідаў, тысячы яго супляменнікаў, ураджэнцаў Узбекістана ўдзельнічалі ў баях за вызваленне Беларусі. Ордэн Чырвонага Сцяга, пра які тут гаворка — яшчэ адно таму пацвярджэнне. Выявіў жа ўзнагароду жыхар Гродна Дзмітры Перасада, разбіраючы рэчы памерлых бацькоў жонкі. Як трапіў ордэн да іх — пакуль невядома. Мужчына звярнуўся ў ваенкамат з просьбай канкрэтызаваць: каму ён раней належаў. І высветлілася, што ўзнагароджаны быў ордэнам 26 верасня 1943 года лейтэнант Шаўкат Карыеў (Шавкат Кариев), 1923 года нараджэння, прызваны ў РККА Сталінскім РВК горада Ташкента. Інфармацыя пра яго ёсць на інтэрнэт-партале "Подвиг народа". Загінуў герой пры вызваленні Беларусі ў 1944 годзе. Ордэн Шаўката Басытавіча пасля яго смерці, відаць, зберагаўся ў начальніка штаба яго пантоннага батальёна: ветэран пасля вайны жыў у Гродне.

Пакуль што знайсці сваякоў загінулага воіна не ўдалося, ордэн перададзены ў Амбасаду Узбекістана.


БЕЛТА
У часе цырымоніі перадачы ордэна, якая прайшла ў ваенкамаце Гродзенскай вобласці

# Навуковы подзвіг Яўхіма Карскага



Акадэмік Яўхім Карскі

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Гэта, напрыклад, артыкулы “Белорусские песни с. Березовца, Новогрудского уезда, Минской губ.” (Варшава, 1884), “Белорусские песни деревни Новосёлок-Затрокских, Виленской губернии, Трокского уезда” (1889). Вельмі дакладна зроблена ў тэкстах перадача ўсіх адметнасцяў рэгіянальных гаворак. Навуковец разумеў: для грунтоўнага вывучэння пытання патрэбна будзе глыбокая, сістэмная праца. І “Программа для собирания особенностей белорусского наречия” спачатку была складзена ў 1897-м “по поручению Императорской Академии наук профессором Императорского Варшавского университета Е. Ф. Карским”. Потым была й другая праграма — праз 19 гадоў. Яўхіму Карскаму ўдалося разабрацца з многімі пытаннямі, што ўзнікалі ў дачыненні да “старого западнорусского наречия” — так называлі ў той час беларускую мову. Ён быў арыгінальным і ў той жа час пераканаўчым у тлумачэнні мовы так званых Літоўскіх летапісаў, асаблівасцяў пісьма ды мовы Мсціславава Евангелля — помніка старажытнарускай культуры пачатку XII стагоддзя. Вучоны ажыццявіў сістэмную рэканструкцыю гісторыі славянскай кірылаўскай палеаграфіі, нетрадыцыйна разглядзеў каштоўныя ўзоры славянскага кірылічнага пісьма з X па XVIII стагоддзе. Пры тым звярнуўся да таго праблемнага поля па гісторыі рускай ды украінскай моў, якое раней не асвойвалася славістамі. (Цікава, што менавіта ў Кіеве наш зямляк атрымаў вучоную ступень магістра: 23 кастрычніка 1893 года ён абараніў там магістарскую дысертацыю “Да гісторыі гукаў і форм беларускай гаворкі”. Савет Кіеўскага ўніверсітэта прысудзіў Яўхіму Карскаму вучоную ступень магістра рускай мовы ды славеснасці за даследаванні беларускай мовы, і гэта была першая ў гісторыі дысертацыя па беларускім мовазнаўстве. — **Рэд.**)

Сёння ўжо відавочна: трохтомная праца Яўхіма Карскага “Беларусы” стала этапнай падзеяй у гісторыі беларусазнаўства. Нават памер манаграфіі ўражвае: 7 тамоў, амаль 3000 друкаваных старонак! Першы том пабачыў свет у 1903 годзе, апошняя кніга трэцяга тому — у 1922-м. Галоўны вынік даследавання — навуковае абгрунтаванне нацыянальнай самабытнасці беларусаў.

Першы том меў назву “Введение в изучение языка и народной словесности”. Прычым усе асноўныя сюжэтныя лініі завязаны ў ім на праблемным комплексе наконт этнагенеза беларускага народа. (Некаторыя працы Яўхіма Карскага ў ПДФ-фармаце можна пабачыць тут: https://knihi.com/Jauchim_Karski/ — **Рэд.**)

Цікава з сённяшняга дня зазірнуць у тое мінулае. Кім жа ўсведамляў сябе сярэднестатыстычны беларус на той момант, калі працаваў Яўхім Карскі над першым томам? У ім чытаем: “Въ настоящее время простой народъ въ Бѣлоруссіи не знаетъ этого названія. На вопросъ: кто ты? простолюдинъ отвѣчаетъ — русскій, а если онъ католикъ, то называетъ себя либо католикомъ, либо полякомъ; иногда свою родину назоветъ Литвой, а то и просто скажетъ, что онъ “тутэйшій” (tutejszy) — здѣшній, конечно противополагая себя лицу, говорящему по-великорусски, какъ пришлому въ западномъ краѣ”. Пры разглядзе этнагенеза беларусаў ураджэнец вёскі Лашы фактычна выносіць за дужкі балцкі субстрат і паказвае, што




Вокладка кнігі, выдадзенай у 2020 годзе ў Мінску

тут па сутнасці ўсё вырашыў субстрат славянскі, які быў прадстаўлены трыма племяннымі саюзамі: крывічамі, дрыгавічамі, радзімічамі. На яго думку, у працэсе фармавання беларускай народнасці тлустая кропка пастаўлена была ў XIV стагоддзі, у часе росквіту Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага (ВКЛ). Пры тым даследчык лічыць: пачатак вырашальнага этапа ў названым працэсе супадае з утварэннем ВКЛ.

Навуковец гранічна дакладна сфармуляваў адказ на пытанне: “Дзе знаходзіцца спрадвечныя беларускія землі?” Яўхім Карскі прапанаваў свой варыянт прахоДжання этнічных межаў народа, які даў свету Янку Купалу, Якуба Коласа, а пазней і Васіля Быкава, Івана Мележа ды многіх іншых вядомых людзей. Даследчык падвёў моцны канцэптуальны грунт пад складанне “Этнаграфічнай карты Беларусі пачатку XX стагоддзя”. Карта выклікала шырокую цікавасць з боку спецыялістаў, якія працавалі ў розных галінах — а на календары ж 1903 год, і былі яшчэ напярэдзе рэвалюцыі, жорсткія войны, неаднаразовыя змены беларускіх межаў… Канешне ж, і да яго, і пасля даследчыкі спрабавалі зрабіць свае “этназамеры”. Прыкладам, у 1864 годзе з’явіўся Атлас расійскага этнографа А. Ф. Рыттіха. Пазней выйшла “Этнографическая карта Европейской России 1875 года Александра Риттиха”. У падручніках пішацца, што працы тыя акрэсліваюць тэрыторыю рассялення беларусаў такім чынам: “На захад і поўдзень ад Сувалак (на захад ад Беластока) (польскае: Suwalki, цяпер — горад у Падляскім ваяводстве. — **Рэд.**), і далей па рэках Нараў, Ясельда, Прыпяць да яе ўпадзення ў Дняпро, на поўнач і ўсход паўночней Вільні, далей на Свянцяны (цяпер — Швянчоніс, горад на ўсходзе Літвы, за 84 км на паўночны ўсход ад Вільнюса. — **Рэд.**), Люцын (так называлася паселішча да 1920 года, цяпер — Лудза (латышскае й латгальскае напісанне: Ludza), горад на ўсходзе Латвіі. — **Рэд.**), Вялікія Лукі, на захад ад Вязьмы і Мгліна (Мглін сёння — райцэнтр у Бранскай вобласці Расіі. — **Рэд.**), затым па Дняпры да вусця Прыпяці”. Дык вось, менавіта Яўхім Карскі дзякуючы сваім даследаванням пашырыў этнічную тэрыторыю беларусаў і на правабярэжжа Прыпяці, і на ўсход — аж да Ржэва й Бранска.

Пачытайце ягоныя кнігі. Як захапляльна падае сын зямлі беларускай гісторыю матчынай мовы! Ён прапаноўвае пры тым і свой варыянт яе перыядызацыі. Можна смела назваць інтэлектуальным трыумфам тое, што беларускую мову Яўхім Карскі разглядвае як паўнацэнную, адметную ў еўрапейскім моўным кантэксце. Навуковец высвятляе, ці можна звесці да адзінага кораня мовы, якія былі роднымі для Янкі Купалы, Аляксандра Пушкіна, Мікалая Каперніка, Мікалоюса Чурлёніса? І даказвае наяўнасць узаемасувязяў, якія гістарычна склаліся. Ды кожная з пералічаных моў мела ўжо тады спецыфічныя асаблівасці, беларуская мова — не выключэнне. І яе адметнасці даследаваныя сістэмна, з асаблівай увагай.

У другім томе, пад назвай “Язык белорусского племени”, бачым два напрамкі ў даследчыцкім працэсе. Аналізуецца гукавы й граматычны лад старабеларускай ды сучаснай аўтару беларускай мовы — як у народна-дыялектнай форме, так і ў літаратурнай. Па кожным з напрамкаў ёсць абагульненне.

Трэці том — “Очерки словесности белорусского племени” — навуковец пачаў пісаць у дасавецкім часе, а заканчваў тады, калі ў краіне ўжо былі пры ўладзе бальшавікі-ленінцы. Першы выпуск трэцяга тома “Народная поэзия” ўбачыў свет у 1916 годзе, калі Яўхім Карскі быў абраны акадэмікам Пецярбургскай акадэміі навук. Выданне другога выпуска “Старая западно-русская письменность” датуецца 1921 годам. На той час Яўхім Фёдаравіч ужо трывала прапісаўся ў савецкай навуковай эліце. У 1921-м яго запрасілі на адказную працу ў Петраград, і ён назаўсёды развітаўся з Бацькаўшчынай. Там ужо заканчваў трэці выпуск трэцяга тома “Художественная литература на народном наречии”, ён пабачыў свет у 1922 годзе. І ў той жа год Яўхіма Карскага абралі правадзейным членам Інбелкульта — з якога й вырасла з часам Акадэмія навук Беларусі.

Звернемся да ўзгаданых выпускаў трэцяга тома. У першым выпуску бачым спалучэнне гіпотэзаў з падмацаванымі моцнай аргументацыяй палажэннямі ды высновамі. Гіпотэзы тычацца гістарычных каранёў фальклору й паэзіі таго народа, да якога належаў аўтар. Былі акрэслены праблемы, над якімі пазней працавалі паслядоўнікі Карскага. І наогул: няма тых жанраў і відаў беларускага фальклору й беларускай народнай паэзіі, пра якія б не ішла гаворка ў выпуску “Народная поэзия”. Аўтар высвятляе: ці існавала агульная ўсходнеславянская фальклорная прастора? Выкладае шэраг цікавых фактаў на прадмет сувязяў беларускага фальклору з фальклорам іншых усходніх славян. На суд чытачоў вынесена й аўтарская версія культуралагічнага вымярэння крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. У архітэктоніку першага выпуска вельмі арганічна ўпісаўся рэтраспектыўны погляд на гераічны эпас.

Датычна выпуска “Старая западно-русская письменность” трэба найперш адзначыць: перад намі ўзор грунтоўнай сістэматызацыі літаратурнай спадчыны. На высокім навуковым узроўні зроблена класіфікацыя помнікаў беларускай літаратуры, якія маюць дачыненне да больш чым 400-гадовага перыяду. Ён пачаўся, калі ў асноўным завяршана было фарміраванне тэрыторыі ВКЛ, працягваўся да канца яго існавання. Дарэчы, старабеларуская мова была да 1696 года дзяржаўнаю мовай ВКЛ. Але, калі меркаваць па змесце другога выпуска, тая мова нікуды не знікла й пасля 1696-га. Навуковец выступіў піянерам у комплексным даследаванні чыннікаў, якія прадвызначылі генезіс пісьменнасці на старабеларускай мове. Чыннікі сацыяльна-палітычнага характару прааналізаваныя не менш глыбока, чым культурна-гістарычныя. Зроблены важныя абагульненні наконт мастацкай літаратуры таго перыяду. Канешне ж, пераважала арыгінальная літаратура, якой даецца збалансаваная ацэнка, прааналізавана й перакладная літаратура, якой было нашмат менш.

Выпуск 3 — “Художественная литература на народном наречии” — трэцяга тома прыйшоўся вельмі дарэчы ў пару, калі ажыццяўлялася палітыка беларусізацыі. Яна стымулявала вялікую цікавасць у БССР да беларускай літаратуры XIX — пачатку XX стагоддзя. Бо тая літаратура й падрыхтавала нашаніўскае адраджэнне. Усебаковы паказ той літаратуры й складаў змястоўную частку выпуска. Яўхім Фёдаравіч нетрадыцыйна падаў беларускае адраджэнне, якое грунтавалася на ранейшым, нашаніўскім.

З 1921 года, пасля выдання фундаментальнай працы “Беларусы”, яе аўтар жыў і працаваў на адказных пасадах у Петраградзе (з 1924 года — Ленінград), там і памёр 29 красавіка 1931 года. Пахаваны на Смаленскіх могілках. У 1929-м да Яўхіма Карскага прыйшло й міжнароднае прызнанне: яго абралі правадзейным членам Чэшскай акадэміі навук і мастацтваў. Аднак у савецкай краіне ўжо наспявалі новыя падзеі. У верасні 1930-га ён быў раптоўна зняты з пасады дырэктара Музея антрапалогіі ды этнаграфіі. Апошнія сем месяцаў жыцця акадэмік увогуле не займаў адказных пасад: пэўна, таму, што рэзка перамянілася стаўленне прыўладных эліт да ідэолагаў палітыкі беларусізацыі, а Яўхім Карскі быў, безумоўна, з іх шэрагаў.

З вышыні часу бачна: хваля жорсткіх рэпрэсій прайшла, прыхапіўшы з сабою шмат ахвяр, а напісанае, зробленае акадэмікам Карскім — засталося нам у спадчыну. Каб ведалі мы, памяталі ды анікому, ніколі вялікі Скарб Роднай Мовы, што ад прадзедаў атрымалі ды зберагалі-павялічылі, не аддавалі.



Помнік на магіле Яўхіма Карскага ў Санкт-Пецярбурзе

**Міхаіл Стралец,**
доктар гістарычных навук

# Даследавацць — каб глыбей разумець

## Вынікі конкурсу даследчых работ “Беларусы Латвіі. Мінулае і сучаснасць” за 2019–2020 гады падвялі ў Рызе

Сёмы ўжо раз прайшоў такі конкурс, які, нагадаю, мае розныя намінацыі. Першая: “Беларусы Латвіі. Цікавыя асобы”. Другая: “Беларуская гісторыя і культура ў Латвіі”. Трэцяя: “Беларускія традыцыі маёй сям’і”. Усе гэтыя намінацыі былі, дарэчы, і раней, а з 2019 года з’явілася “Латвія і Беларусь: насустрач адзін аднаму” — для таго, каб стымуляваць вывучэнне ўзаемадачыненняў краін і народаў у гістарычным кантэксце, пашырэнне латвійска-беларускай супрацы па розных кірунках у нашым часе.

Падводзілі вынікі конкурсу летась 5 снежня з выкарыстаннем інтэрнэт-тэхналогіі: на платформе ZOOM. У імпрэзе паўдзельнічалі старшыня Саюза беларусаў Латвіі ды кіраўніца конкурсу Алёна Лазарава, чальцы журы: ганаровы старшыня Саюза беларусаў Латвіі Валянціна Піскунова, сябар праўлення СБЛ, педагог беларускай мовы Алёна Міцкевіч, сябар праўлення СБЛ, журналістка газеты “Прамень” Іна Олесава. Далучыліся да размовы ўдзельнікі конкурсу ды Ніна Фёдараўна Грыгор’ева — завуч Рыжскай Беларускай асноўнай школы імя Янкі Купалы.

Сёлета на конкурс было прадстаўлена 8 даследаванняў. Журы ацэньвала ўсе работы па крытэрыях: мова, адпаведнасць тэме й намінацыі, аб’ём, стыль, ілюстраванне. Дарэчы, ужо надрукавана й кніга-штогоднік з прадстаўленымі работамі, якую атрымае кожны з удзельнікаў конкурсу. А ў электронным выглядзе зборнік будзе адпраўлены ўсім беларускім таварыствам Латвіі. Распачалася ж імпрэза з разгляду даследаванняў, якія правялі вучні згаданай беларускай школы.

Ганна Сцепанян, вучаніца 8-га класа, напісала работу “Жыццё і творчасць Уладзіміра Пігулеўскага”. Дзяўчына распавядае пра цікавую асобу: вядомы тады ўраджэнец Гродна дзякуючы вялікаму ўнёску у жыццё беларускай дыяспары Латвіі ў першай палове ХХ стагоддзя ды і ўвогуле ў культуру Латвіі. Уладзімір Васілевіч вядомы як нацыянальны дзеяч, пісьменнік, драматург, чалавек шырокай эрудыцыі, які добра ведаў французскую, чэшскую, польскую, беларускую ды ўкраінскую мовы. З 1922 года жыў у Латвіі, выкладаў у Дзвінскай беларускай гімназіі, у 1924–25 гадах быў дырэктарам Беларускай гімназіі ў Лудзе (удакладнім, што да 1920-га то быў Люцын, горад на ўсходзе Латвіі, у Латгаліі, а навучальная ўстанова — Люцынская беларуская гімназія. — **Рэд.**). Складаў падручнікі для беларускіх дзяцей, вёў вялікую асветніцкую работу, пісаў п’есы для беларускага тэатра. Некаторы час Уладзімір Пігулеўскі быў дэпутатам Сейма, загадчыкам беларускага аддзела Міністэрства адукацыі Латвіі.

Даследванне 8-класніка Паўла Міхеева “Рыгор Барадулін: паэт і перакладчык” прысвечана было апошняму народнаму паэту Беларусі (Рыгору Івановічу высокае званне было нададзена ў 1992 годзе, і пазней яго ўжо не надавалі. — **Рэд.**). Вучань скрупулёзна вывучыў жыццёвы шлях паэта, паказаў яго повязі як з беларускім, так і з латышскім народам, што засведчана было атрыманнем дзяржузнагарод: у Беларусі ён атрымаў ордэн Дружбы народаў, а ў Латвіі — ордэн Трох Зорак. У даследванні, на жаль, няма спасылак на вершы, цытат, што было б нялішнім, бо жыццёвыя прынцыпы літаратара заўсёды прыўносяцца ў ягоныя творы.

За дзве цікавыя працы — пра Уладзіміра Пігулеўскага ды Рыгора Барадуліна — мы ўдзячныя й кіраўніку згаданых навуковых работ, педагогу школы Юрыю Якаўлеву: ён прыцягвае вучняў да цікавай даследчай дзейнасці, абуджае ў іх інтарэс да беларускай гісторыі, культуры.

Далей разглядаліся два даследаванні ў намінацыі “Цікавыя асобы” ад беларускіх таварыстваў. Алёна Лазарава зрабіла й вынесла на суд журы ад Беларускага таварыства “Прамень” (Рыга) работу “Алёна Міцкевіч — крыніца натхнення, адукацыі ды творчасці беларусаў Латвіі”. Гераіня творчай работы вырасла ў вёсцы Мікалаеўшчыне (Стаўбцоўскі раён, Міншчына) — гэта родныя мясціны Якуба Коласа. Бацька яе любіў паэзію, сам пісаў вершы, у паэтычным асяроддзі Наднямоння ўвабраў у сябе любоў да роднае мовы й пранёс яе праз усё жыццё. Сама ж Алёна закончыла беларускае аддзяленне літаратурна-музычнага факультэта Мінскага педінстытута, працавала настаўніцай беларускай мовы ў 60-й школе Мінска, потым — у беларускім аддзяленні Навукова-даследчага інстытута педагогікі. А пасля пераехала ў Рыгу. З першых крокаў беларускага руху ў Латвіі Алёна Міцкевіч — шчыры “праменевец”, шматгадовая спявачка ансамбля беларускай песні “Надзея”, актыўны дзеяч Саюза беларусаў Латвіі. Яна — і аўтар сцэнараў буйных імпрэзаў СБЛ, журналістка газеты “Прамень”, верная й нястомная актывістка беларускай дыяспары. Алёна Лазарава напісала пра сваю цёзку паэтычна й задушэўна, выкарыстала шмат цытат з вершаў, аздобіла работу фотаздымкамі з розных імпрэзаў, зладжаных СБЛ, здымкамі ўзнагарод Алёны Міцкевіч як ад Латвіі, так і ад Беларусі.


Уладзімір Пігулеўскі з вучаніцамі Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі. 1924 год.


Яніна Юзэфовіч

Станіслаў Валодзька з Даўгаўпілскага Беларускага культурна-асветніцкага таварыства “Уздым” даслаў на конкурс работу “Яніна Юзэфовіч — таленавітая асоба”. Вядомы паэт расказвае пра цікавага чалавека, высакародную працу спадарыні Яніны ў якасці кіраўніцы вакальнага ансамбля “Спадчына” (Даўгаўпілс) ды песеннага ансамбля “Узоры” (Лівaны). Цягам многіх гадоў энтузіястка, нягледзячы на адлегласць, кіруе музкалектывамі, працуе над якасцю гучання, чысцінёй выканання народнай песні, шукае песенны матэрыял. Добра дапаўняюць аповед Станіслава ўключаныя ў работу меркаванні спявачак Лідзіі Знотыні (Лівaны), Ліліі Воранавай (Даўгаўпілс), уражанні карэспандэнта інтэрнэт-партала “Грани.LV” Ірыны Плячко пра спадарыню Яніну як бескарыслівага, шчырага й адданага сваёй справе чалавека. Праўда, варта было б пашырыць аб’ём работы, падаць больш звестак пра гераіню.

У намінацыі “Беларускія традыцыі маёй сям’і” прадстаўлена было даследаванне “Распавед ад душы” Валянціны Грыбоўскай, сяброўкі Беларускай суполкі “Мара” (Ліепая). Работа вельмі цікавая, шчырая, напісана з душой ды замілаваннем ад успамінаў пра сям’ю, родную вёску Бабаевічы, што ў Клецкім раёне Міншчыны. Аўтарка з пяшчотай расказвае пра сваіх блізкіх: тату, маму, бабулю. Добра перададзены дух высокай маральнасці ды еднасці, у якім жылі людзі роду “пад Польшчай” (бо гэта Заходняя Беларусь), у ваенныя часы, галодныя пасляваенныя… Паказаны прынцыпы выхавання ў сям’і: у працы, у павазе да чалавека. Цікавае спалучэнне дзвюх моў — роднай, беларускай, і рускай — як знак пашаны да памяці бабулі, якая “прыбілася” да сям’і ды зрабілася роднай не па расце, а па духу ў выніку жыццёвых абставінаў. На жаль, аніводнага фотаздымка не пададзена ў рабоце, што зніжае ўражанне ад яе.

Намінацыя “Беларуская гісторыя і культура ў Латвіі” прадстаўлена дзвюма работамі. Супрацоўніца Даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры Ірына Апейнанэ правяла даследаванне “Беларуская кухня ва ўспрыманні жыхароў Даўгаўпілса”. Для таго апытала 73 рэспандэнты: 59 жанчын і 14 мужчын ад 19 да 56 гадоў. Распытвала: што яны знаюць пра беларускую кухню ды як да яе ставяцца. Цікава, што 40 адсоткаў апытаных беларускую кухню звязваюць з бульбай, кожны пяты з іх любіць дранікі, яшчэ знаюць калдуны, бабку, бліны. Цікава, што беларускую кухню апытаныя ўспрымаюць як простую, але сытную, “дамашнюю”. Прасочваецца ў рабоце, напісанай у стылі навуковага даследавання, уплыў на беларускую кухню народаў-суседзяў: палякаў, літоўцаў, рускіх ды латышоў.

Мікалай Паўловіч, сябра даўгаўпілскага Беларускага культурна-асветніцкага таварыства “Уздым”, напісаў работу “Аглонская базіліка” (у сяле Аглона, цэнтр паломніцтваў). Ён падаў гісторыю рэстаўрацыі нацыянальнай каталіцкай святыні знутры, бо й сам удзельнічаў у будаўнічых работах, раскопках пахаванняў пры касцёле. Напісана работа эмацыйна, жыва, зацікаўленым і даследчым чалавекам. Аднак зніжае ўражанне ад яе адсутнасць фотаздымкаў, а мы ж ведаем, што аўтар сам — гісторык, збірае артэфакты.

У намінацыі “Латвія і Беларусь: насустрач адзін аднаму” зрабіла даследаванне Іна Олесава, сяброўка рыжскага Беларускага таварыства “Прамень”. Работа называецца “Пад знакам года малой Радзімы”. Спадарыня Іна правяла грунтоўную, вялікую працу — яна сабрала, прааналізавала ўспаміны ды ўражанні 11 чалавек-праменеўцаў (яны расказалі пра свае родныя куткі), склала з іх, як пазл, цэласную карціну краіны Беларусі — з яе славутымі святынямі, велічнай спадчынай продкаў, дасягненнямі сённяшняга дня. Шчыра, кранальна Іна Олесава расказвае пра сваю малую радзіму — старадаўнюю вёсачку Карзюкі, якая ў гэтым стагоддзі знікла, увайшла ў межы Мінска. (Пра тое быў аповед і ў нашай газеце — гл. “Жылі-былі Карзюкі” — ГР, 17.05.2018. — **Рэд.**) Гэтая работа — яркае сведчанне патрыятызму латвійскіх беларусаў і ў той жа час праяўленне павагі да латышскага народа, сярод якога мы жывём.

Запрашаем усіх, каму тое цікава, паўдзельнічаць сёлета ў чарговым конкурсе даследчых работ “Беларусы Латвіі. Мінулае і сучаснасць”. Дзякуючы рэалізацыі праекта мы даследуем і глыбей спасцігаем невычарпальную побытавую, духоўную, культурную спадчыну беларусаў, прыадкрываем багатую палітру лепшых якасцяў супляменнікаў: як прадстаўнікоў беларускага роду ў Латвіі. Хто праводзіць даследчыя работы, хто з імі потым знаёміцца — усе адчуваюць гонар за Бацькаўшчыну. Пададзеныя на конкурс працы штогод пацвярджаюць пачэснае месца беларусаў у Латвіі як неад’емнай часткі яе шматнацыянальнага народа.

**Алёна Міцкевіч**,
члец журы конкурсу
г. Рыга


Рыгор Барадулін у маладосці, з маці

# Багата песень там — як журавін!

## Артысткі фальклорна-этнаграфічнага гурта “Спасаўка” з Жыткавіцкага раёна нібы на чароўным пароме праз гады перавозяць нашчадкам вялікія скарбы: народныя песні, абрады, звычаі

Як цяпер перад вачыма той дзень з далёкага лета на Палессі. Быў 1964 год, я дабіраўся з Жыткавіч, з райцэнтра, у Тураў, дзе працаваў харэографам. На Прыпяці ж была ў той час паромная пераправа, і можна было няспешна па баках агледзецца. Што цяпер: праляціш над ракой па мосце — і ўсе ўражанні. (Першы мост цераз Прыпяць на дарозе Жыткавічы — Тураў быў пабудаваны ў 1985 годзе, з часам запатрабаваў вялікай рэканструкцыі, якая закончылася восенню 2018-га. — **Рэд.**). Там, пры пераправе, прыгожа цвілі кветкі, з балацянках, што параслі хмызняком, чуліся спевы птушак ды кваканне жаб’юкоў. Пабачыў яшчэ вялікі статак кароў (знак заможнасці вёскі) ды саму вёску Чэрнічы. Па вуліцы яе ішлі жанчыны з граблямі — пэўна, з сенакосу. І што ўразіла мяне: спявалі яны, і так далёка было чуваць па-над ракой, і такая ў іх песня была мілагучная!

ВАСІЛЬ КУЛІКОЎ



**Самадзейныя артысткі гурта “Спасаўка” з сябрамі ў Чэрнічах. Восень 2020 года.**

Вось ён, вобраз майго Палесся! Празрыста-чыстае паветра, дзівосная прырода, працавітыя, таленавітыя людзі, упрыгожаныя роднымі песнямі. Самі працуюць як мурашы — і дзяцей да працы з пялюшак, можна сказаць, прывучаюць. А вечарамі, гаспадарку ўправіўшы, жанчыны на вуліцы збіраюцца, дзе й вогнішча пры лаўцы запаляць ды спяваюць, байкі розныя баюць. Вось і я прысеў тады ў Чэрнічах да вогнішча, распытваў: як жанчыны ўсё паспяваюць? І калгасную працу, і сваю парабіць, і дзетак мужой дагледзець. У адказ пачуў: хто жадае, у таго часу на ўсё хапае — толькі лянівамуяго ўсё няма. Тады ж Ніна Яхімовіч, Вольга Толкач напераба й расказвалі, што яшчэ ў 1962-м утварыўся ў іх фальклорны гурт “Журавінка”. Бо, тлумачылі, у тамтэйшых мясцінах журавін багата — “то і ў ягады мы паспяваем хадзіць, і песні родныя паспяваць”. Заспявалі адну з іх: “Ціха, ціха ды на вуліцы ціха”. Потым яшчэ “Ты ўчора не быў, і цяпер нема...” Жартавалі: у нас тут багата песень — як журавін! З тых часоў ведаю імёны спявачак: Вольга Якушэвіч, Паліна Маркевіч, Вольга Жыткавец, Мар’я Вярэніч ды Мар’я Юншыц, ды яшчэ сёстры Вольга й Марыя Маркевіч. Казалі: разам усе, дружна жывём, адно аднаму дапамагаем у радасці ды ў горы.

З АРХІВА КАЦЯРЫНЫ САНЕЦ



**Першы рад, злева направа: Ніна Хмялеўская, Вольга Якушэвіч, Кацярына Санец. Другі рад: Наталля Маркевіч ды Анастасія Бабаткова. 2020 год.**

У хуткім часе пасля стварэння вясковы гурт узначаліла Кацярына Санец (пачала загадваць мясцовым клубам з 1965-га) — і яшчэ суладней галасы загучалі, пабольшала выступленняў, пашырыўся рэпертуар. Праз год ужо Міністэрства культуры БССР атэставала фальклорна-этнаграфічны калектыў “Спасаўка” з вёскі Чэрнічы як народны. Былі ўжо ў ім і новыя спявачкі: Вольга Семчанок, Галіна Меляшчэня, Наталля Маркевіч, Ніна Хмялёўская, Наста Бабаткова, Наста Літвіненка, Святлана Герээла. Прычым яны ўжо не толькі спявалі — танцавалі таксама. Мне як харэографу карцела даведацца: што? Казалі: “Падушэчку” танчаць, ставяць жартоўныя інсцэноўкі “За Івана не пайду”, “У сераду, бабка!”, водзяць на сцэне вясновыя ды жніўныя карагоды. А калі спявалі Купальскія песні, то русалкі Купальскія з жартамі забіралі-зацягвалі да сябе ў кола хлопцаў.

І так арганічна прыжыўся гурт “Спасаўка” ў Чэрнічах! Самадзейныя артысткі праводзілі прама ў вёсцы вясельныя абрадавыя дзеянні (а нешта з іх і на сцэну пераносілі), былі жаданымі гасцямі на святах навакольных вёсак ды штогод праводзілі свята сваёй. Жанчыны тады расказвалі мне, што дзеці ў іх павырасталі, хлопцаў яны пажанілі, дзяўчат замуж павыдавалі — нават у Расію, Латвію, Украіну. Маючы “песенную прышчэпку” з Бацькаўшчыны, некаторыя з іх таксама ў самадзейнасці. А як у адпачынак вяртаюцца да родных сваіх, то весялосці на вуліцы цераз край — з вечара да ранку.

З таго далёкага 1964-га я й пасябраваў з таленавітымі “народнымі артысткамі” са “Спасаўкі”. Бывала, і сустракаліся з імі (адзін жа раён), выступаючы на святочных сцэнах, артысты майго, тураўскага, таксама народнага ансамбля танца “Прыпяць”. З гадамі прыйшлі ў фальклорна-этнаграфічны гурт новыя людзі: Мікола Леўкавец, Святлана Лагвіненка. Ну а Тамара Мацукевіч, Наталля Маркевіч, а таксама Вольга Якушэвіч ды Кацярына Санец — гэта сёння “залаты фонд” калектыву. А золата, як вядома, не старэе і не ржавее. Ды й калі ж ім старэць? Няма калі! Кажуць: як спяваючы працаваць, то й рукі не баляць. А спяваюць яны, дарэчы, нават і на градах сваіх, з зямелькай працуючы. Той самай, дзівосны водар якой акрыляе, амаладжвае і сілаў дадае.

Як ні пазваню калі сяброўкам з Мінска, то зноў яны, “спасаўкі” мае родныя, у канцэртных клопатах. То ў Магілёў едуць, то ў Гомель ці Гродна іх запрасілі, альбо суседзі з Брэстчыны клічуць. Памятае іх галасы фальклорны фэст “Покліч Палесся”, што ў Ляскавічах праходзіць, і старажытны Тураў. А то, бывае, напякуць палюшак (маленькія булачкі ў Чэрнічах), купяць цукерак — і ў Дом састарэлых, да тых людзей, што песню родную ім перадалі. А калі заспяваюць там “Ой, матулька мая, а я ж донька твая”, то ўсе ў слёзы: і гледачы, і артысты. Потым настрой падымуць прыпеўкамі, песняй з прытанцоўкай: “Я кахала Колю-Колю — і цукерак ела ўволю/ А цяпер кахаю Ваню ды зубамі барабаню”.

Калі пачаў я працаваць у Мінску, то не раз, бывала, запрашаў “Спасаўку” ў сталіцу: выступалі артысткі з поспехам на розных пляцоўках. Удзельнічаў гурт у тэлепраекце “Спявай, душа!”, аздараўленчым праекце Юрыя Радзькова “За здаровую Беларусь!”, здымаўся ў тэлефільме “Зямля, якая дае мне сілы” (відэа ёсць на сайце пісьменніка, прадпрымальніка Валерыя Сарокі). Згадваю: аніколі артысткі з Чэрніч не адмаўляліся ад паездак! Хатнія справы, кажуць, пачакаюць (і мужы з тым ужо звыкліся) — а людзям радасць трэба падарыць. Зрэшты, я й сам такі: без творчасці — няма жыцця. І ў “спасавак” сэрцы, душы ўжо не могуць жыць без песень, а калі спяваюць, то сабе гады прадаўжаюць.

Гурт “Спасаўка”, мяркую, сярод фальклорна-этнаграфічных у нашай краіне — найстарэйшы. Дзейнасць жа яго, як з гордасцю адзначае Кацярына Санец, кіраўніца гурта й загадчыца Чэрніцкага клуба-бібліятэкі, ніколі не перапынялася. Заўважана творчасць талентаў з глыбінкі: ушаноўвалі спявачак на конкурсе-аглядзе народных калектываў “Напеў зямлі маёй”, раённым конкурсе “Кола абрадавых святаў”, ёсць “з вобласці” грамата: “За зберажэнне народных рэгіянальных традыцый”... Ды, пэўна ж, найвышэйшая ўзнагарода й асалода зберагальніцам фальклору — калі адгукаюцца на іх песні душы гледачоў. Хто жыве ў сілавым полі народнай культуры, той нас, артыстаў самадзейных, разумее. І я еду зноў і зноў на Палессе, у Чэрнічы. Каб сустрэцца з артысткамі “Спасаўкі”, пачуць іх быліцы-небыліцы, паслухаць песні душэўныя, пабачыць добрыя вочы палешукоў — людзей, якія ў суладдзі жывуць і з сабою, і роднай зямлёю, і з Небам высокім.



**Кацярына Санец (справа) з гарманісткай Валянцінай Абібок**

**Мікола Котаў,**
фалькларыст

## 2021: Год народнага адзінства


Чытайце газету ў інтэрнэце на партале zviazda.by

Падпісацца на газету “Голас Радзімы” можна ў паштовых аддзяленнях Беларусі

**Заснавальнік:** Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Выдавецкі дом «Звязда»”
**Галоўны рэдактар** Іван ЖДАНОВІЧ

**Адрас рэдакцыі:** 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Пакой 907.
**E-mail:** golas_radzimy@tut.by
**Тэлефон:** + 375-17-3111726

**Рэдакцыйнае пасведчанне №61.** Выдадзена 16.07.2018 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Выдавец:** Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Выдавецкі дом «Звязда»”. Дырэктар – галоўны рэдактар Алесь Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

**Аб’ём выдання:** 2 друк. арк.
**Падпісана да друку:** 25.03.2021 г.
**Наклад 167.**
**Заказ –**
Выходзіць 1 раз у месяц

**Месца друкавання:** Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства “БудМедыяПраект”. ЛП №02330/71 ад 23.01.2014. Вул. Веры Харужай, 13/61. 220123 Мінск, Рэспубліка Беларусь



© “Голас Радзімы”, 2021

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца й не рэцэнзуюцца. Пазіцыі рэдакцыі ды аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.